Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 САКАВІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 50 (28160) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Аблігацыі — у белым спісе**

СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**



**Манастыр у «Зорных войнах»**

СТАР. 13

## Дзве Марыі з Мар'янкі



Марыя Паўлаўна ЛОБАН і Марыя Дзмітрыеўна АРЦЮХОВІЧ нарадзіліся і ўсё жыццё пражылі ў вёсцы Верасніца Жыткавіцкага раёна, нават у адной ясе частцы — з прыгожай назвай Мар'янка. Жанчыны не проста аднагодкі, а нарадзіліся дакладна ў адзін дзень. 8 лютага яны адзначылі 80-гадовы юбілей. Да пенсіі Марыі працавалі паляводамі ў калгасе. Выгадавалі дзяцей, пахавалі мужоў. Ужо даўно дарослыя ўнукі, падрастаюць праўнукі. А бабулі Марыі, як у гады маладосці, збіраюцца на «вячоркі», вышываюць каляровыя малюнкі і кветкі і добрым словам згадваюць сваю Мар'янку, якая стала цэнтрам іх жыцця.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
*anatol@zviazda.by*

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва пры Савеце Міністраў Беларусі:**

*«У нашай краіне можа з'явіцца закон аб санаторыях і курортах. Раней ужо ішла работа над такім праектам, але ў канчатковым выніку на ўзроўні ўрада было заключэнне, што мэтазгоднасці ў распрацоўцы такога закону няма. Думаю, што з улікам рэалій, якія апошнім часам змяніліся, сёння гэтае пытанне трэба абмяркоўваць. Зараз ва ўмовах зніжэння попыту з боку расійскага спажыўца адна з асноўных задач — дыверсіфікацыя экспарту паслуг».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.03.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20344,00 | ▼ |
| Еўра | 22889,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 296,83 | ▲ |
| Укр. грыўня | 758,40 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

16050

■ 50+

## НОСЬБІТ ВОПЫТУ І ВЕДАЎ

### Пажылыя людзі — вельмі каштоўная частка грамадства

**Навукоўцы ў апошні час пачалі актыўна вывучаць феномен старасці і ролю пажылых людзей у грамадстве. І гэта не дзіўна: чалавецтва старэе, доля пажылых у развітых краінах, у тым ліку і ў Беларусі, расце, і з гэтым неабходна лічыцца. Пра тое, чым беларускія пенсіянеры адрозніваюцца ад еўрапейскіх, якая палітыка дзяржавы ў дачыненні да пажылых найбольш эфектыўная і чаму неабходна павышаць пенсійны ўзрост, мы пагаварылі з начальнікам аддзела даследаванняў рынку працы, занятасці і сацыяльнай абароны насельніцтва Навукова-даследчага інстытута працы, членам Бюро рабочай групы па пытаннях старэння ААН Ганнай ЗАКРЭЎСКАЙ.**

***— Ці можна беларусаў назваць нацыяй, якая старэе?***

— Мяркуйце самі: у нас у краіне на канец 2015 года пражывалі 2 мільёны 593 тысячы грамадзян пенсійнага ўзросту (маюцца на ўвазе жанчыны, старэйшыя за 55 гадоў, і мужчыны, старэйшыя за 60 гадоў). За апошнія 5 гадоў колькасць беларускіх пенсіянераў вырасла на 5%, або на 124 тысячы чалавек. Гэта нямала. На сённяшні дзень практычна кожны чацвёрты беларус — пенсіянер. Так што доля пажылых людзей у нас вельмі значная. У цэлым гэтая тэндэнцыя характэрная для ўсёй Еўропы. Хоць, калі браць нашых найбліжэйшых суседзяў — Літву, Латвію, Эстонію, там доля пажылых яшчэ большая, чым у нас. Для прыбалтыйскіх краін цяпер характэрна ўнутрыеўрапейская працоўная міграцыя, калі маладыя людзі і маладыя сем'і з дзецьмі пераязджаюць у краіны, дзе ім прасцей знайсці высокааплатную працу. Таму ў Прыбалтыцы цяпер даволі высокі ўзровень занятасці пенсіянераў: свабодныя працоўныя месцы запаўняюцца пенсіянерамі.

СТАР. 2

**ПАДПІСКА-2016**

## ПАДАРУНАК ДА СЯЎБЫ

**«Год глядзела агарод, а ўбіраю — недарод:
з тым і гэтым прагадала, бо «Крынічку» не чытала...».
Аўтарка гэтых радкоў («Звязда» за 2 сакавіка г.г.),
вядомая агародніца Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны,
трошкі, відаць, схітрыла
(чаго не зробіш дзеля краснага слоўца?!):
выпісвае яна «Звязду», досыць уважліва чытае —
не прапускае пры гэтым выпускі «Крынічкі»,
бо прызнавалася неяк, што знаходзіць там шмат
карыснага, нягледзячы на багатую практыку...
А вось з-за чаго і насамрэч мог атрымацца
той «недарод» — прычым у любога сейбіта —
дык гэта з-за ранніх халадоў, з-за недахопу вільгаці.**

Каб засцерагчы сваіх падпісчыкаў, сярод якіх, вядома ж, няма-ла вяскоўцаў і дачнікаў, ад падобнай небяспекі, «Звязда» падчас новай падпісной кампаніі ўключыла ў спіс прызоў адмысловыя падарункі. Сярод іх — палівальныя наборы (спіральныя шлангі з пісталетамі) і цяпліца (сам каркас і да яго сотавы полікарбанат).

Шанц выйграць нешта згаданае ёсць у кожнага з індывідуальных падпісчыкаў — на першае паўгоддзе, на другі квартал. І для таго, каб гэта зрабіць, вялікіх намаганняў не трэба: дастаткова запоўніць змешчаны ніжэй купон і не пазней за 11 красавіка даслаць яго ў рэдакцыю. А там...

Нашы продкі заўважалі: не шукаючы, не знойдзеш, не гуляючы, не выйграеш.

Спрабуйце! А раптам?

***P.S.*** *Больш падрабязная інфармацыя аб правілах гульні ў нумары за 12.03.2016.*

СТАР. 5

ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА**

**5 разоў на тыдзень!**

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2016 года!

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# ЧАКАЕМ ІНВЕСТАРАЎ. СУМЛЕННЫХ І АДКАЗНЫХ

**Наша краіна і Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця выказваюць узаемную зацікаўленасць у інтэнсіфікацыі супрацоўніцтва ў цэлым і па кожным канкрэтным праекце. Пра гэта ішла размова на сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі і віцэ-прэзідэнта ЕБРР Алана Пію.**

Беларусь прапануе ЕБРР інвеставаць, перш за ўсё, у мадэрнізацыю прадпрыемстваў, што дасць магчымасць вырабляць запатрабаваную прадукцыю глыбокай перапрацоўкі і з высокай дабаўленай вартасцю. У час сустрэчы асабліва падкрэслівалася, што краіна адкрыта для любога інвестара, гатова падтрымаць усе цікавыя праекты, рэалізацыя якіх будзе садзейнічаць стварэнню новых рабочых месцаў і прыцягненню высокіх тэхналогій. У той жа час важна, каб інвестар быў гатовы працаваць сумленна і адказна.

Такога ж прынцыпу заўсёды прытрымліваецца ў адносінах з дзелавымі партнёрамі сама Беларусь, за што яе і цэняць, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што беларускі бок ніколі не даваў невыканальных абяцанняў, ні да кога не паддобрываўся і не будзе рабіць гэтага ў далейшым.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь не пойдзе на праекты, якія не прыносяць карысць дзяржаве. На гэта настроена ўся вертыкаль улады. «Нас народ выбраў для таго, каб абараняць інтарэсы дзяржавы. Але мы абсалютна не супраць прыватнага бізнесу — адказнага бізнесу, які дбае ў тым ліку пра дзяржаву, а не толькі спрабуе зарабіць у сваю кішэню», — сказаў Аляксандр Лукашэнка і дадаў, што такіх адказных бізнесменаў у краіне дастаткова.

У Еўрапейскім банку рэканструкцыі і развіцця набылі пазітыўны вопыт работы ў Беларусі і лічаць яе добрым месцам для інвеставання. Пры ўсіх цяжкасцях, якія існавалі ва ўзаемаадносінах Беларусі з Еўрапейскім саюзам, ЗША, банк заўсёды з ёй супрацоўнічаў.

Цяпер сітуацыя змянілася. Беларусь можа весці больш адкрыты дыялог з ЕС, канстатаваў Прэзідэнт. «Гэта добры сігнал, фактар і для нас, і для вас. Ёсць магчымасць нарошчваць наша супрацоўніцтва. Галоўнае, што Беларусь да гэтага гатова», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Віцэ-прэзідэнт Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця Алан Пію ў сваю чаргу адзначыў, што ЕБРР і беларускія кампаніі, урады за час сумеснай работы дасягнулі высокай ступені даверу, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. Цяпер у банка ёсць магчымасць зрабіць у Беларусі яшчэ больш, і гэтыя перспектывы былі абмеркаваны на сустрэчы віцэ-прэзідэнта ЕБРР і кіраўніка беларускай дзяржавы.

# Выкарыстаць рэсурсы эфектыўна

**Праблемай №1 старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ назваў стварэнне дадатковых эфектыўных працоўных месцаў. Ён пабываў з працоўнай паездкай у Гомельскай вобласці і адзначыў, што тут, як і паўсюль па краіне, ёсць пытанні па іх прыросце.**

— Але ж ёсць і канкрэтныя падыходы і праекты, каб ствараць дадатковыя працоўныя месцы, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — І гэта тычыцца не толькі дзяржаўных прадпрыемстваў, але і прадпрыемстваў розных формаў уласнасці, у тым ліку замежных, якія паспяхова працуюць на Гомельшчыне. Сёння, калі ідзе абмеркаванне пытанняў пенсійнай рэформы і павышэння пенсійнага ўзросту, самае галоўнае — стварыць такія месцы, бо гэты аб'ём працоўных рэсурсаў трэба эфектыўна выкарыстоўваць.

На базе Гомельскага і Буда-Кашалёўскага раёнаў адбылося пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі. Яно было прысвечана рабоце органаў мясцовага кіравання і самакіравання па павышэнні эканамічнага патэнцыялу рэгіёнаў, паляпшэнні прадпрымальніцкага асяроддзя, прыцягненні інвестыцый і стварэнні новых працоўных месцаў.

Сенатары начале з Міхаілам Мясніковічам наведалі агракамбінат «Паўднёвы», РДУП «Беларуснафта-Асобіна», СУП «Андрэеўка» і ТАА «Вахавяк Плюс». На прыкладзе сельгаспрадпрыемстваў прааналізавана работа па скарачэнні выдаткаў на вытворчасць прадукцыі, рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, замацаванні маладых спецыялістаў, стварэнні новых працоўных месцаў. Абмяркоўваліся пытанні экспарту, прыцягнення дадатковых прыбыткаў у мясцовыя бюджэты, фінансава-эканамічнага аздараўлення неплацежаздольных сельскагаспадарчых арганізацый і іншыя.

Між тым, адзначыў Міхаіл Мясніковіч, на Гомельшчыне шмат напрацовак, якія можна рэкамендаваць для ўкаранення ў іншых рэгіёнах нашай краіны:

— Тут ажыццяўляецца мэтанакіраваная работа па наведзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні вясковых населеных пунктаў. Ёсць прынцыпова новыя формы падыходу, і гэты вопыт Гомельшчыны мы будзем рэкамендаваць для распаўсюджвання ў іншых рэгіёнах нашай краіны. Мы, як орган тэрытарыяльнага прадстаўніцтва — Савет Рэспублікі, імкнёмся задзейнічаць той вялізны дэпутацкі патэнцыял, які сканцэнтраваны ў Саветах усіх узроўняў. А гэта 19 тысяч дэпутатаў. Гэтыя людзі павінны ў тым ліку асабістым прыкладам садзейнічаць таму, каб вытворчасць была эфектыўнай, а прадукцыя — канкурэнтаздольнай. Безумоўна, трэба павышаць адказнасць і дысцыпліну кадраў. Размова ідзе не толькі пра кіраўнікоў, але і пра іх галоўных спецыялістаў, у тым ліку фінансавых. Калі размова ідзе пра замену кіраўніка, трэба мяняць усю каманду. Тады эфект будзе большым.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліў, што павышэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі часта звязана з аптымізацыяй колькасці працаўнікоў, таму галоўная задача ўлад — даць грамадзянам працу:

— Прэзідэнт справядліва патрабуе: калі скарачаецца колькасць занятых, то чалавек павінен, вобразна кажучы, прыйсці на прадпрыемства праз дарогу і атрымаць працу там. Неабходна імкнуцца да таго, каб не проста максімальна зменшыць колькасць беспрацоўных, але і цалкам замяніць усе неэфектыўныя працоўныя месцы на высокапрадукцыйныя. Для гэтага ёсць усе ўмовы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

■ Парламенцкі дзённік

# ДОБРЫ ПАЧАТАК

## ПЕРШЫ БЕЛАРУСКА-ТАЙЛАНДСКІ БІЗНЕС-ФОРУМ ПРАХОДЗІЦЬ У БАНГКОКУ

**Пра гэта паведамляе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Ва ўрачыстым адкрыцці прыняў удзел Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, спікер ніжняй палаты нашага парламента, які з афіцыйным візітам знаходзіцца ў Тайландзе.**

Перад пачаткам форуму ён сустрэўся са старшынёй гандлёвай палаты Тайланда Ісарам Вагкусалкітам. Абодва бакі выказаліся за павелічэнне прысутнасці беларускіх і тайландскіх тавараў на рынках дзвюх краін.

«Аб'яднаўшы свае патэнцыялы, мы можам значна павысіць канкурэнтаздольнасць нашых краін на сусветных рынках, — заявіў спікер Палаты прадстаўнікоў падчас выступлення перад удзельнікамі форуму. — Гэтаму, несумненна, будзе спрыяць дружба Беларусі і Тайланда ў такіх буйных інтэграцыйных аб'яднаннях, як Еўразійскі эканамічны саюз і Асацыяцыя дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі».

Уладзімір Андрэйчанка выказаў упэўненасць, што з улікам геаграфічнага становішча Беларусь магла б стаць добрым плацдармам для прасоўвання тайландскіх тавараў на рынкі краін Еўрапейскага саюза і Еўразійскага эканамічнага саюза. Ён звярнуў увагу на той факт, што за апошнія дзесяць гадоў беларуска-тайландскі тавараабарот вырас амаль у пяць разоў. Аднак, на думку старшыні Палаты прадстаўнікоў, узровень гандлёва-эканамічных адносін не можа нас задавальняць, паколькі не адпавядае існуючаму патэнцыялу.



«Нам ёсць што прапанаваць адно аднаму, — заявіў ён. — Тайланд — краіна з развітой прамысловасцю і аграрным сектарам. Мы зацікаўлены ў прыходзе ў Беларусь буйных тайландскіх кампаній, гатовы павялічыць прамы імпарт каўчуку, рысу, морапрадуктаў і іншых тавараў. Беларускія вытворцы могуць таксама значна пашырыць пералік прадукцыі, якая пастаўляецца ў Тайланд».

Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся са старшынёй Тайскай асацыяцыі вытворцаў замарожаных харчовых прадуктаў Поджам Арамватананонтам. Па інфармацыі прэс-службы, абодва бакі ўпэўнены, што гэтая сустрэча дапаможа развіццю супрацоўніцтва дзвюх краін у сферы сельскай гаспадаркі і харчавання. Прадстаўнікі асацыяцыі выказалі намер наведаць Рэспубліку Беларусь для ўдзелу ў сельскагаспадарчай выставе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*
**Фота прадстаўлена прэс-службай Палаты прадстаўнікоў**

■

# НОСЬБІТ ВОПЫТУ І ВЕДАЎ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Да якіх наступстваў можа прывесці старэнне нацыі?***

— Ёсць такі паказчык, як нагрузка на працоўнае насельніцтва. Сёння на 100 работнікаў прыпадае 58 пенсіянераў. Яшчэ адзін паказчык — каэфіцыент дэмаграфічнай нагрузкі. Ён разлічваецца на тысячу чалавек працаздольнага ўзросту і, як аказалася, штогод расце. Напрыклад, у 2010 годзе каэфіцыент дэмаграфічнай нагрузкі складаў 366 чалавек. Паводле апошніх звестак Белстата за 2014 год, на тысячу чалавек працаздольнага ўзросту цяпер прыпадае 400 пенсіянераў. Чым гэта пагражае? Ростам эканамічнай адказнасці працаздольных грамадзян за тых, хто не працуе, у прыватнасці за пенсіянераў.

***— Якія яшчэ тэндэнцыі апошняга часу вы маглі б адзначыць?***

— Перш за ўсё — паступовы рост эканамічнай актыўнасці пажылых людзей. Маюцца на ўвазе грамадзяне, якія, дасягнуўшы пенсійнага ўзросту, працягваюць працаваць. У сярэднім яны працуюць яшчэ 5 гадоў. Па выніках 2015 года, у нас працаваў кожны чацвёрты пенсіянер. Для параўнання — у 2005 годзе працаваў толькі кожны пяты пенсіянер. Усяго сёння працуе 651 тысяча пенсіянераў. Гэта даволі вялікі паказчык.

Зноў-такі, калі паглядзець агульную колькасць людзей пенсійнага ўзросту, няцяжка заўважыць, што сярод іх больш жанчын — практычна ў два разы. Для нагляднасці: калі мы возьмем траіх пенсіянераў, то з іх двое будуць жанчыны і адзін — мужчына. Адпаведна, такая ж прапорцыя захоўваецца і сярод працуючых пенсіянераў. Гэта звязана з дэмаграфічнай структурай насельніцтва, са смяротнасцю перш за ўсё. Пасля 30 гадоў мужчыны пачынаюць, груба кажучы, «высейвацца». Хлопчыкаў нараджаецца больш, але пасля 30 гадоў колькасць мужчын і жанчын становіцца роўнай. А потым, з узростам, колькасць жанчын пачынае павялічвацца. Калі браць пажылы ўзрост, там жанчыны складаюць пераважную большасць.

***— У якіх галінах часцей за ўсё працягваюць працаваць пасля выхаду на пенсію?***

— Найбольшая колькасць пенсіянераў працуюць у сферах адукацыі, аховы здароўя і сацыяльных паслуг. Нямала іх і ў прамысловасці — сярод работнікаў там практычна кожны чацвёрты з'яўляецца пенсіянерам. А ў навуцы працуючых пенсіянераў — больш за 30%.

Дарэчы, калі казаць аб працуючых пенсіянерах, то па звестках за 2015 год, у краіне ёсць людзі, якія працягваюць працаваць і пасля 90 гадоў. Усяго такіх — 21 чалавек. Але найбольш актыўна працуюць пенсіянеры ва ўзроставай групе 60-64 гады. Так, у нас працягваюць працаваць 198 тысяч пенсіянераў да 65 гадоў. Хачу заўважыць, што рост эканамічнай актыўнасці пажылога насельніцтва — гэта добрая прыкмета.

***— Што вы можаце ў цэлым сказаць пра сучасных пажылых беларусаў? Ці праводзіце якія-небудзь даследаванні?***

— Мы нядаўна праводзілі даследаванне на тэму ўцягнутасці пажылых людзей у грамадскае жыццё і ўбачылі, што наша старэйшае пакаленне займае даволі пасіўную пазіцыю. З аднаго боку, людзі быццам чагосьці хочуць — кудысьці схадзіць, у чымсьці паўдзельнічаць, але, з другога боку, ёсць праблемы, якія перашкаджаюць гэтаму. Гэта і адсутнасць цікавасці і захапленняў, і пасіўныя песімістычныя ўстаноўкі. Дарэчы, гарадскія старыя, як правіла, больш актыўныя. У вёсцы ўсё складаней — не так развіта інфраструктура, цяжка акунуцца ў сацыяльнае жыццё.

Некаторая частка пажылых людзей займае ўтрыманскую пазіцыю. Між тым дзяржава сёння не можа ахапіць падтрымкай абсалютна ўсіх, убачыць патрэбы кожнага. Але яна можа падтрымаць ініцыятыву. Калі ў пэўнай групы людзей ёсць нейкая патрэба, пра гэта трэба заяўляць, праяўляць ініцыятыву, а не чакаць, што нехта пастукаецца ў дзверы і прынясе ўсё, што трэба, нават не спытаўшы папярэдне пра тое, што ж канкрэтна трэба. А ў нас пакуль што многія людзі сядзяць і чакаюць.

Хоць у апошні час у нас з'явілася досыць шмат грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку і для пажылых людзей. Людзі самі ствараюць нейкія гурткі, праводзяць мерапрыемствы. Гэта ўсё пачалося нядаўна, і гэты рух актыўна развіваецца.

Дарэчы, абследаванне, пра якое я казала вышэй, праводзілася валанцёрамі ва ўзросце. Яны апытвалі пажылых людзей, вызначалі іх інтарэсы і магчымасці ўдзелу ў грамадскім, у тым ліку культурным і палітычным жыцці свайго населенага пункта.

***— Як на дзяржаўным узроўні прыцягнуць пажылых да актыўнага жыцця?***

— У нас на сённяшні дзень асноўныя меры дзяржаўнай падтрымкі накіраваны на людзей у старэчым узросце, не здольных даглядаць сябе і забяспечыць сабе годнае існаванне. Сёння, кіруючыся вопытам іншых краін, нам трэба выпрацоўваць захады, пры якіх пажылы чалавек становіцца больш актыўным, здольным удзельнічаць у грамадскім жыцці, арганізаваць сам сабе падтрымку. Гэта значыць, нам трэба накіраваць намаганні на папераджальныя меры — і ў першую чаргу на падтрыманне актыўнасці пажылога чалавека. Дзяржава, усведамляючы цяпер гэтую праблему, палітыку ў галіне старэння выводзіць у разрад прыярытэтных.

***— З пункту гледжання даследчыка — чаму сёння неабходна павышаць пенсійны ўзрост?***

— Сёння мы бачым, што ўсе перадумовы для таго, каб прымаць канкрэтныя меры па павышэнні пенсійнага ўзросту, ёсць. Гэтая выснова зроблена на падставе нашых навуковых даследаванняў.

Чаму трэба гэта рабіць? Па-першае, расце нагрузка на працаздольнае насельніцтва. Па-другое, у нас расце чаканая працягласць жыцця. Па апошніх звестках, яна ў нас складае 72,3 года для мужчын і жанчын у цэлым. Расце і якасць жыцця пажылых людзей — людзі пачынаюць жыць даўжэй і лепш. Маецца тэндэнцыя і да таго, каб пажылыя людзі станавіліся паўнавартаснымі членамі грамадства, атрымлівалі новую адукацыю, новыя навыкі. Яшчэ адна тэндэнцыя — расце ўзровень эканамічнай актыўнасці пажылых. Усё гэта і з'яўляецца перадумовамі для магчымага павышэння пенсійнага ўзросту.

Нават калі ўзяць наш навукова-даследчы інстытут — у нас працуюць шмат пажылых людзей. Сярод іх актыўныя навуковыя супрацоўнікі ва ўзросце 60 гадоў і вышэй. Для нашай сферы вельмі важнай з'яўляецца кваліфікацыя. Чым старэйшы чалавек, чым больш ведаў у яго назапашана за жыццё — тым ён больш карысны і каштоўны для нашай галіны. Таму наша кіраўніцтва імкнецца захоўваць гэтых людзей на працы, каб яны перадавалі маладым свой вопыт, веды. Наогул, пераемнасць вопыту вельмі важная ў любой галіне. Так што з усёй упэўненасцю магу заявіць, што пажылыя людзі — вельмі каштоўная частка грамадства.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў КАЗАХСТАНЕ:
## дэпутатам можа стаць беларус

**Пра гэта падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай пазачарговым выбарам дэпутатаў у мажыліс (ніжнюю палату парламента) Казахстана, расказаў Ергалі Булегенаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол гэтай краіны ў Мінску. Прычынай пазачарговых парламенцкіх выбараў, якія пройдуць ужо ў гэтую нядзелю, паслужыла ініцыятыва дэпутатаў аб роспуску палаты. Па словах дыпламата, парламентарыі выступілі з такой ініцыятывай, каб сумясціць датэрміновыя выбары ў мажыліс з выбарамі ў мясцовыя органы ўлады.**

**У Казахстане з 2018 года праз кожныя паўгода будзе дадавацца па паўгода да пенсійнага ўзросту жанчын. У выніку на пенсію яны стануць выходзіць у 63 гады.**

Пасол падкрэсліў, што ніякай палітычнай падаплёкі ў правядзенні пазачарговых выбараў няма.

• Дарэчы

### ПРЫМУШАЕ ЖЫЦЦЁ

*Для нашай краіны сёння актуальнае пытанне павышэння пенсійнага ўзросту. У Казахстане ўжо даўно пайшлі на гэты крок, а праз некалькі гадоў на пенсію там будуць выходзіць яшчэ пазней.*

*— У свой час прэзідэнт Казахстана стварыў спецыяльныя групы, якія вывучалі вопыт розных краін у сферы пенсійнага забеспячэння, — нагадаў дыпламат. — Цяпер у нашай краіне жанчыны выходзяць на пенсію ў 58 гадоў, мужчыны — у 63 гады. Але ў пазамінулым годзе ў нас зноў узнімалі гэта пытанне. У нас, як і ў Беларусі, пенсіянераў становіцца ўсё больш, працоўных — усё менш. З 2018 года праз кожныя паўгода будзе дадавацца па паўгода да пенсійнага ўзросту жанчын. У выніку на пенсію яны стануць выходзіць таксама ў 63 гады.*

*Па словах Ергалі Булегенава, павышэнне пенсійнага ўзросту — вельмі вострае пытанне, але на такі крок прымушае ісці само жыццё.*

— Ад шасці партый у мажыліс вылучаны 294 кандыдаты ў дэпутаты, — паведаміў Ергалі Булегенаў. — Яны прэтэндуюць на 98 са 107 месцаў. Па Канстытуцыі астатнія 9 месцаў прадастаўлены Асамблеі народа Казахстана, якая на наступны дзень пасля выбараў — 21 сакавіка — выбера сваіх дэпутатаў. Кандыдаты на гэтыя дзевяць месцаў ужо вылучаны, іх 9 чалавек.

— У складзе Асамблеі народа Казахстана ёсць казахстанскі беларус — Уладзімір Бажко, — адзначыў Ергалі Булегенаў. — Ён быў сустаршынёй міжурадавай казахстанска-беларускай камісіі, узначальваў наша міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Уладзімір Бажко — сярод дзевяці кандыдатаў ад Асамблеі народаў Казахстана, якія будуць выбірацца 21 сакавіка. Гэта чалавек, якога ведаюць і падтрымліваюць у Казахстане.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Гэта важна

# ЗАМЕСТ ДЗВЮХ — АДНА
## У Нацыянальны каляндар прафілактычных прышчэпак у мінулым месяцы ўнесены змены

**Адменена, напрыклад, рэвакцынацыя супраць туберкулёзу: раней прышчэпкі супраць гэтага захворвання рабілі на 3-5-ты дзень пасля нараджэння і ў 7 гадоў. Цяпер вакцынацыя будзе праводзіцца толькі пры нараджэнні.**

Паводле слоў **дацэнта кафедры фтызіяпульманалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдата медыцынскіх навук, галоўнага пазаштатнага фтызіяпедыятра Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Жанны КРЫВАШЭЕВАЙ,** вакцынацыя БЦЖ не толькі прафілактуе развіццё туберкулёзу пры сутыкненні з палачкай Коха ў першыя дні жыцця, калі імунітэт яшчэ не сфарміраваны, але і папярэджвае развіццё цяжкіх, небяспечных формаў гэтага захворвання, напрыклад менінгіту. Неабходнасць БЦЖ-вакцынацыі дзяцей ранняга ўзросту ў сучаснай эпідэмічнай сітуацыі не выклікае сумненняў. Якасна праведзеная імунізацыя спрыяе працягламу, да 10 гадоў і болей, захаванню супрацьтуберкулёзнага імунітэту.

Ахоўная функцыя паўторных прышчэпак супраць туберкулёзу не падмацавана навуковымі данымі і шматлікімі кантрольнымі даследаваннямі, якія праводзіліся Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя. Разам з сумніўнай эфектыўнасцю былі доказаны і іх адмоўныя біялагічныя ўздзеянні.

Адмяняецца таксама рэвакцынацыя супраць поліяміэліту ў 18 месяцаў і ў 2 гады. Аптымальным варыянтам з улікам імунітэту папуляцыі застаецца 4-разовая імунізацыя інактываванай («нежывой») вакцыны ў 3, 4, 5 месяцаў і 7 гадоў, паведамляюць у Міністэрстве аховы здароўя. Цяпер у краіне праводзіцца вакцынацыя супраць 12 інфекцый: гепатыту В, туберкулёзу, дыфтэрыі, слупняку, коклюшу, поліяміэліту, адру, паратыту, краснухі, пнеўмакокавай і гемафільнай інфекцыі, грыпу.

**Святлана ПРОТАС.** *protas@zviazda.by*

■ Навука і бяспека

# ГМ-расліны: ад лабараторыі — да доследнага поля



**Трансгенны рапс, устойлівы да гліфасату (гербіцыду), можа быць высаджаны на доследным полі Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі ўжо сёлета.**

Заяўка Белдзяржуніверсітэта разглядалася на Экспертным савеце па біябяспецы генна-інжынерных арганізмаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя яшчэ вясной мінулага года. Пасля праходжання шматлікіх працэдур, у тым ліку і грамадскага абмеркавання, эксперты далі дазвол на вызваленне трансгеннай расліны ў навакольнае асяроддзе на тэрыторыі доследнага поля, якое адпавядае ўсім міжнародным патрабаванням бяспекі.

**Дырэктар Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Валянціна ЛЕМЕШ** расказала, што сення ў краіне абсталяваны па ўсіх міжнародных і нацыянальных стандартах тры доследныя полі для вырошчвання трансгенных раслін: такія пляцоўкі маюць Інстытут генетыкі і цыталогіі, Цэнтральны батанічны сад і Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па бульбаводстве і плодагародніцтве.

У Цэнтральным батанічным садзе вось ужо тры гады вырошчваюцца трансгенныя буйнаплодныя журавіны: у расліну быў унесены ген для ўзмацнення смакавых уласцівасцяў (салодкасці) ягады. А на доследным полі Інстытута генетыкі і цыталогіі цягам двух гадоў вырошчвалася трансгенная бульба, устойлівая да насякомых і грыбных захворванняў. Дарэчы, ген, які адпужваў ад бульбы каларадскага жука, выпрацоўваўся толькі ў бацвінні і адсутнічаў у клубнях, таму для здароўя чалавека не было ніякай пагрозы.

Як патлумачыла Валянціна Лемеш, пакуль што вызваленне трансгенных раслін у навакольнае асяроддзе адбываецца ў нашай краіне толькі ў рамках выканання навуковых праектаў на доследных палях. І робіцца гэта для таго, каб праверыць, як будзе паводзіць сябе трансгенная расліна ў прыродзе. Бо адна справа — вырошчваць ГМ-расліны ў лабараторных умовах, і крыху іншая — пад адкрытым небам на параўнальна вялікай плошчы. Да таго ж у прыродзе пасадкі трэба правяраць цягам некалькіх пакаленняў. Гэта ўсё дарагія даследаванні. Па некаторых звестках, стварэнне аднаго трансгеннага сорту расліны можа каштаваць больш за 1 мільярд долараў. Таму пра вырошчванне ў Беларусі трансгенных раслін у камерцыйных мэтах размова пакуль не ідзе...

Усяго ў свеце дапушчаны да вырошчвання 27 відаў ГМ-раслін (372 трансгенныя лініі), у тым ліку таматы, бульба, рыс, цукровыя буракі, лён, кабачок, дыня, фасоля, салодкі перац, тытунь, цыкорый, папая, пшаніца, люцэрна, сліва, петунія, таполя і іншыя. У лабараторных умовах ствараюцца расліны, устойлівыя і да засухі, і да пераўвільгатнення, і да замаразкаў, і да шкоднікаў, і да цяжкіх металаў. Расліны з палепшанымі смакавымі якасцямі і з карыснымі ўласцівасцямі, напрыклад генетычна мадыфікаваны рыс, які змяшчае вітамін А.

Беларускія навукоўцы працуюць над стварэннем трансгеннай канюшыны з павышанай ураджайнасцю; тытуню, устойлівага да цяжкіх металаў і нафтапрадуктаў; тытуню з паскораным развіццём і павышанай прадукцыйнасцю; лёну-даўгунцу... З апошнім звязваюць надзею на адраджэнне беларускага льнаводства — не сакрэт, што сёння галоўнай праблемай з'яўляецца адсутнасць сартоў, якія дазваляюць атрымаць якаснае льновалакно.

У лістападзе мінулага года ў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя паступіла яшчэ адна заяўка ад Навукова-практычнага цэнтра па земляробстве НАН Беларусі аб правядзенні дзяржаўнай экспертызы бяспекі трансгеннага рапсу. У гэтым выпадку размова ідзе пра рапс, які ўключае ген курынага інтэрферону, і ген, які абумоўлівае ўстойлівасць расліны да гербіцыду. Гэта сумесная з навукоўцамі біялагічнага факультэта БДУ распрацоўка, нацэленая на абарону курынага пагалоўя на нашых птушкафабрыках. Інтэрферон, які павышае імунітэт, не трэба будзе вылучаць з клетак расліны: спатрэбіцца проста высушыць зялёную масу, размалоць яе на звычайным млыне і дабавіць у корм.

Пакуль што на Экспертным савеце заяўка не разглядалася.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ВЯСНА ПАКУЛЬ АДПАЧЫВАЕ...
## Уначы на суботу сіноптыкі прагназуюць да 12 марозу, а на наступным тыдні — месцамі да мінус 15

**Вось нам і ранняя вясна, якую мы часткова сустракалі ўжо ў лютым. У другой палове сакавіка маем снег, парывісты вецер і нават няслабы мароз. Спецыялісты Белгідраметцэнтра паведамляюць, што ў гэтыя выхадныя дні да нас зноў вернецца зімовы характар надвор'я. Ужо ў найбліжэйшыя суткі тэрыторыя Беларусі апынецца пад уплывам актыўнага атмасфернага фронту, за якім будзе паступаць халоднае паветра паўночных шырот. Брр... Нават гучыць холадна.**



Ужо ў пятніцу мы маем няўстойлівае ветранае надвор'е. Удзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу, які пераходзіць у мокры снег. На асобных участках дарог будзе слізка. У многіх раёнах узмоцніцца вецер парывамі да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра складзе ад нуля да 4 цяпла, па поўдні краіны — да плюс 7 градусаў. І гэта толькі кветачкі.

**У нядзелю ўначы і раніцай сіноптыкі аб'яўляюць штармавое папярэджанне. У асобных раёнах будзе ісці моцны снег, мяцеліца, магчымы парывы ветру да 15-20 м/с. Снег будзе месцамі дасягаць 17 см.**

У суботу кароткачасовы снег будзе ісці практычна паўсюдна. На дарогах будзе галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2-9 марозу, пры праясненнях да мінус 10—12 градусаў. Пахаладае і ўдзень, калі чакаецца ад мінус 5 градусаў па паўночным усходзе да 2 градусаў цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Выпрабаванне «складанай зімой» чакае нас у нядзелю. Паўсюдна снег будзе чаргавацца з мокрым снегам. Уначы і раніцай сіноптыкі аб'яўляюць штармавое папярэджанне, бо ў асобных раёнах будзе ісці моцны снег, мяцеліца, магчыма ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с, па паўднёвым захадзе краіны — наліпанне мокрага снегу. На дарогах месцамі захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да мінус 8 градусаў, па паўночным усходзе чакаецца нават да 11 марозу. Удзень будзе ад мінус 5 градусаў па паўночным усходзе да 3 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, і ў пачатку наступнага тыдня захаваецца няўстойлівае і месцамі марознае надвор'е. Так, у панядзелак часам чакаецца снег і мокры снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1-8 марозу, пры праясненнях — да мінус 9-11 градусаў. Удзень будзе ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла, а па паўднёвым захадзе прагназуецца плюс 4-6 градусаў. Бліжэй да серады атмасферны ціск пачне павялічвацца, а умовы надвор'я паляпшацца. Аднак зіма яшчэ не адпусціць. Месцамі пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 1-8 градусаў, пры праясненнях чакаецца да мінус 9 — мінус 15 градусаў. Некамфортна будзе і ўдзень (ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 6 цяпла).

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Факт

### ПРЫЯРЫТЭТЫ — ЗА ІНАВАЦЫЙНЫМІ ПРАЕКТАМІ

У Бялградзе прайшло VII пасяджэнне сумеснай Беларуска-Сербскай камісіі па навуковым супрацоўніцтве пад старшынствам намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Пятра Балтруковіча і міністра адукацыі, навукі і тэхналагічнага развіцця Рэспублікі Сербія Срджана Вербіча. Удзел у рабоце прыняў і беларускі пасол у Сербіі Уладзімір Чушаў. Ён паведаміў «Звяздзе», што былі разгледжаны пытанні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, прасоўвання інавацыйных праектаў, выпуск высокатэхналагічнай прадукцыі. Па выніках пасяджэння зацверджана праграма навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва на 2016—2017 гг., а таксама — выканаўчая праграма навукова-тэхнічнага і інавацыйнага супрацоўніцтва на 2016—2017 гг.

**Сяргей ШЫЧКО.**

### ПЕРШЫ КРОК ДА МАРЫ

**Тым, хто марыць пра афіцэрскія пагоны, а таксама тым, хто яшчэ не вызначыўся з будучай прафесіяй, 19 сакавіка варта наведаць Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча. З 10.00 да 13.00 тут адбудзецца Дзень адчыненых дзвярэй.**

Пра асаблівасці навучання ў вучылішчы і сёлетнія ўмовы паступлення будучыя абітурыенты змогуць пачуць непасрэдна з вуснаў камандавання. Акрамя таго, падлеткі на свае вочы ўбачаць умовы жыцця і побыту суворaўцаў, пазнаёмяцца з элементамі вучэбна-матэрыяльнай базы.

Для тых, хто не ведае: установа адукацыі «Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча» знаходзіцца па адрасе: **г. Мінск, вул. М. Багдановіча, 29.** Дабрацца сюды можна тралейбусамі №№ 12, 29, 40, 46, 53 і аўтобусамі №№ 38, 91 (ад станцыі метро «Няміга» да прыпынку «Оперны тэатр»). Калі ўзнікнуць пытанні, тэлефануйце 297-29-00, 334-04-78

■ Выгадныя грошы

# КАРПАРАТЫЎНЫЯ АБЛІГАЦЫІ ТРАПІЛІ Ў БЕЛЫ СПІС

## У прыватнасці — даходы па іх не абкладаюцца падаходным падаткам

**Ільготны рэжым падаткаабкладання даходаў, якія атрыманы ад карпаратыўных аблігацый, прадоўжаны ў нашай краіне на 2016 і 2017 гады. Рашэнне аб гэтым днямі прыняў кіраўнік дзяржавы пасля азнаямлення з праектамі ўказаў па развіцці фінансавага рынку.**

Нагадаю, што карпаратыўныя аблігацыі цяпер могуць выпускацца прадпрыемствамі і банкамі ў мэтах прыцягнення рэсурсаў. Ільготны рэжым па лініі падаткаабкладання гэтых каштоўных папер дзейнічаў з 2008 года і паказаў сваю эфектыўнасць. У выніку прадпрыемствы самі, а не праз банкі, прыцягвалі сродкі для свайго развіцця, што для іх было нашмат танней. Карпаратыўныя аблігацыі такім чынам служаць альтэрнатывай банкаўскім крэдытам. Гэта для тых, хто іх выпускае. Звычайных прыватных кліентаў больш цікавяць каштоўныя паперы такога фармату, якія банкі прапануюць для насельніцтва. Больш за тое, людзі звычайна набываюць валютныя аблігацыі банкаў. Менавіта з нюансамі функцыянавання падобных каштоўных папер мы і паспрабуем разабрацца.

### РЭАЛЬНА — ПАД 5% ГАДАВЫХ

Адразу пасля прыняцця рашэння аб неабкладанні падатковым падаткам даходаў па карпаратыўных аблігацыях банкі прапанавалі фізічным асобам новыя валютныя аблігацыі на прад'яўніка. Сёння амаль усе банкаўскія структуры займаюцца выпускам такіх каштоўных папер. Мы ў сваім аналізе паспрабавалі разгледзець прапановы двух сістэмаўтваральных банкаў.

Валютныя аблігацыі выбраных намі банкаў прапануюцца насельніцтву ў доларах і еўра. Фіксаваная стаўка даходу па іх складае 5% гадавых. Тэрміны абарачэння розных выпускаў гэтых банкаў складаюць ад мінімальных 1,5 года да 978 дзён (больш за 2,5 года). Практычна ў кожным выпуску новых каштоўных папер існуюць аблігацыі з намінальным коштам у 1 тысячу, 3 тысячы і 5 тысяч долараў, а таксама — у тысячу і тры тысячы еўра.

Больш дробныя камерцыйныя банкі таксама прапануюць кліентам валютныя аблігацыі, аднак працэнтны даход па іх сёння нават меншы, чым у выбраных.

### ПЛЮСЫ ДАТЭРМІНОВАГА ПАГАШЭННЯ

Калі галоўная ўмова размяшчэння (стаўка даходу) нашых валютных аблігацый аднолькавая, то трэба шукаць адрозненне па іншых кірунках. Напрыклад, пры выпуску валютных аблігацый адным банкам прадугледжана іх датэрміновае пагашэнне не раней чым праз 18 месяцаў з даты іх набыцця. Другі банк дазваляе датэрміновае пагашэнне сваіх каштоўных папер ужо праз 6 месяцаў пасля дня куплі аблігацыі. Аб чым гэта сведчыць і што гэта дае патэнцыяльнаму пакупніку каштоўных папер?

У першым выпадку ўласнік каштоўнай паперы павінен разумець, што на бліжэйшыя 1,5 года ён ні ў якім выпадку ніякіх грошай (акрамя працэнтаў) ад банка не атрымае, бо гэта не прадугледжана ўмовамі выпуску аблігацыі. Другі банк прапануе таксама пазыковую паперу на працяглы тэрмін, але прадугледжвае датэрміновае яе гашэнне ўжо праз 180 дзён і (галоўнае) абсалютна без страты даходнасці па такой аблігацыі. Што адбываецца з такой аблігацыяй менавіта ў гэтым другім выпадку? Уласніку такой каштоўнай паперы галоўнае «пратрымацца» гэтыя першыя 6 месяцаў. Потым не абавязкова пагашаць такую паперу датэрмінова, але сам факт таго, што аблігацыю надалей на працягу амаль цэлага года ў любы дзень можна беспраблемна пагасіць, дарагога варты.

**Цяпер банк мае права змяніць прадмет закладу па аблігацыях, аднак тады пакупнік каштоўнай паперы можа прад'явіць аблігацыю да датэрміновага пагашэння.**

Дарэчы, пры такім датэрміновым пагашэнні аблігацыі гаспадару выплачваецца яе намінальны кошт і недаатрыманы даход (у валюце наміналу) да даты датэрміновага пагашэння аблігацыі ўключна.

### ПАРАДАК І ГРАФІК ВЫПЛАТЫ ПРАЦЭНТНАГА ДАХОДУ

Непасрэдна на самой каштоўнай паперы прапісаны графік налічэння і выплаты працэнтнага даходу па кожным выпуску валютных аблігацый. Працягласць перыяду, за які банк выплачвае кліентам працэнты, складае 3 ці 6 месяцаў. Пасля завяршэння гэтага перыяду (ці некалькіх перыядаў) уладальнік паперы можа прыйсці ў банк па свае працэнты ў любы працоўны дзень або атрымаць гэты даход адначасова з намінальным коштам аблігацыі ў дзень яе пагашэння.

Заўважу, што банк выплачвае кліентам намінальны кошт аблігацыі ў дзень яе пагашэння ў бясспрэчным парадку. Такое пагашэнне можа ажыццяўляцца безнаяўнымі грашыма або наяўнымі банкнотамі ў валюце наміналу. Гэта так, але ў адным аддзяленні банка нам паведамілі, што пры пагашэнні аблігацый на буйную суму грошай (больш за 5 тысяч долараў) не ў сваім структурным падраздзяленні (там, дзе былі набыты гэтыя паперы), лепш папярэдне заказаць у банка грошы за некалькі дзён да «даты пік». Спецыяліст банка нам удакладніў, што падобны заказ грошай можна ажыццявіць нават па тэлефоне.



Распарадзіцца аблігацыяй у некаторых банках можна і іншым спосабам. Так, фінансавая ўстанова можа прыняць валютную аблігацыю ад фізічнай асобы ў якасці пагашэння абавязкаў (адступное). Толькі прыняцце аблігацыі ў якасці адступнога ажыццяўляецца не раней за дату, пасля якой уладальнік аблігацыі мае права пагасіць яе датэрмінова.

Як вядома, валютныя аблігацыі на прад'яўніка прадаюцца банкамі фізічным асобам практычна без умоў, бо паказваць пашпарт у гэтым выпадку не трэба. Між іншым, у банкаўскай установе ўсё ж такі могуць адмовіцца прадаць аблігацыі фізічнай асобе. Гэты пункт гучыць так: «Аперацыі з аблігацыямі, якія падпадаюць пад асаблівы кантроль у адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі з мэтай папярэджвання легалізацыі даходаў, што атрыманы злачынным шляхам, і фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці, ажыццяўляюцца пры ўмове прад'яўлення фізічнай асобай — удзельнікам аперацыі дакумента, які ўдакладняе яе асобу».

У аддзяленні аднаго з банкаў нам растлумачылі, што ў банкаўскіх работнікаў могуць узнікнуць, напрыклад, сумненні легальнасці грошай, калі чалавек набывае аблігацыі за наяўныя банкноты на даволі вялікую суму грошай.

### ВАЖНЫЯ ДРОБЯЗІ

Папярэдне, да набыцця такіх каштоўных папер, будучаму іх уладальніку будзе нялішнім азнаёміцца ўвогуле з праспектам эмісіі валютных аблігацый. Звычайна яны размешчаныя на сайтах банка ў раздзеле «Новыя прапановы для фізічных асоб», а папяровая копія — непасрэдна ў цэнтрах продажу (філіялах і структурных аддзяленнях банка). Самі праспекты даволі аб'ёмістыя і часам дасягаюць 20-40 аркушаў.

Калі набываеш аблігацыю ўпершыню, то пачытаць бегла можна і ўсё. А звяртаць увагу — абавязкова на знакавыя пункты. Напрыклад, у апошнім праспекце эмісій валютных аблігацый найбуйнейшага банка краіны ёсць адзін пункт, які мяне крыху збянтэжыў. Аб чым там гаворыцца?

Цяпер банк мае права змяніць прадмет закладу па аблігацыях, аднак тады пакупнік каштоўнай паперы можа не згадзіцца з такой заменай і прад'явіць аблігацыю да датэрміновага пагашэння. І ў гэтым выпадку банк такую паперу датэрмінова пагасіць толькі пры выкананні адной умовы — аблігацыю трэба прынесці ў месячны тэрмін пасля даты апублікавання інфармацыі аб замене прадмета закладу. Што мы маем у выніку? Уладальнік аблігацыі можа датэрмінова пагасіць яе не толькі, напрыклад, праз 18 месяцаў, але і раней, калі своечасова заўважыць інфармацыю аб замене банкам прадмета закладу.

Каму датэрміновае гашэнне такіх папер увогуле не цікава, то ён на падобную дробязь можа не звяртаць увагі. Тут я толькі ўдакладню, што за «звер» такі — прадмет закладу. Напрыклад, у адным аддзяленні буйнога банка мне паведамілі, што апошнія выпускі іх каштоўных папер забяспечаны ў якасці закладу дзяржаўнымі валютнымі аблігацыямі, якія былі прададзены нашым Мінфінам юрыдычным асобам (банкам) пад 7% гадавых. Атрымліваецца, што дзяржава прадае банкам аблігацыі пад 7%, а апошнія прапануюць нам (насельніцтву) пад 5% гадавых. Тут усё лагічна, і банкі такім чынам зарабляюць свае законныя 2%.

**Тэрміны абарачэння розных выпускаў гэтых банкаў складаюць ад мінімальных 1,5 года да 978 дзён (больш за 2,5 года).**

Аднак дзяржаўныя аблігацыі таксама маюць тэрмін абарачэння. А пасля пагашэння дзяржаўных папер банк вымушаны будзе змяніць прадмет закладу на нешта іншае (непасрэдна валюта, золата, іншыя кантоўныя паперы і г. д.). Калі гэта сур'ёзны банк, дзе доля дзяржавы складае каля 80-90%, то вялікай розніцы ў замене прадмета закладу асабіста я і не бачу. Адзінае, што існуе дадатковая падстава ў больш ранні тэрмін пагасіць каштоўную паперу датэрмінова. А гэта для кліента нават плюс.

Дарэчы, чытачам нашага выдання тут пашанцавала ўдвайне, бо інфармацыю аб падобных змяненнях найбуйнейшы банк краіны друкуе менавіта ў нашай газеце. Таму ўладальнікам валютных аблігацый застаецца толькі ўважліва чытаць «Звязду» ці заўсёды праглядаць усе старонкі выдання (PDF-версіі) на нашым сайце ў сеціве.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

***У наступным матэрыяле рубрыкі «Выгадныя грошы» мы раскажам аб тым, што даходнасць дэпазітаў у беларускіх банках лепшая, чым у суседніх краінах. Матэрыял «Расійскія ўкладчыкі панеслі грошы ў Беларусь» шукайце ў бліжэйшых нумарах газеты***

■ Фінансы

# Нацбанк зніжае стаўку рэфінансавання на 1%

**Такім чынам, з першых дзён красавіка фінансавы рэгулятар краіны вызначае стаўку рэфінансавання на ўзроўні 24% гадавых, паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка Беларусі.**

Таксама з гэтай даты адначасова зніжаны нарматыў фонду абавязковых рэзерваў — на 0,5% да 7,5%. У Нацбанку адзначылі, што гэтае рашэнне прынята «ў межах абазначанай раней задачы па зніжэнні памеру рызыка-прэміі ў кошце крэдытаў і з улікам аналізу наяўных рызык».

Аналітыкі ад фінансавага рынку ўпэўнены, што змяненне гэтага паказчыка павінна станоўча паўплываць на далейшую стабілізацыю ў грашова-крэдытнай сферы краіны і паспрыяе змяншэнню кошту крэдытных рэсурсаў для рэальнага сектара эканомікі.

Нагадаем, што апошні раз стаўка рэфінансавання ў Беларусі змянялася летась 9 студзеня. Тады яна была павялічана адразу на 5 працэнтных пунктаў, да 25% гадавых.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Факт

# ПОДЗВІГ НЕ ЗАБЫТЫ

**Споўнілася 20 гадоў, як у Віцебску адчыніўся музей воінаў-інтэрнацыяналістаў — першы дзяржаўны тэматычны на постсавецкай прасторы.**

Дарэчы, менавіта віцебскія дэсантнікі першымі пачалі выконваць інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане. У гонар юбілею ў іншым музеі — Віцебскім абласным краязнаўчым — запрацуе выстава (з 18 сакавіка). На прэзентацыі будуць выкананы песні, прысвечаныя героям афганскай кампаніі, і паказаны відэафільм.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# ПАЛІТЫКА? ПАРУШЭННЕ ЗАКОНА!

**Прэс-цэнтр Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі пракаментаваў паведамленні ў інтэрнеце наконт затрымання на беларуска-літоўскай мяжы двух мужчын, якое быццам мае палітычную падаплёку.**

Літаральна за некалькі дзён смаргонскім пагранічнікам прыйшлося некалькі разоў убачыцца з двума мінчанамі ва ўзросце 39 і 42 гадоў, і вось пры якіх абставінах гэта адбывалася. 10 сакавіка мужчыны, маўляў, прыехалі да свайго сябра ў населены пункт Гудагай, аднак... Яны не мелі дакументаў на права знаходжання ў пагранічнай зоне, за што і былі прыцягнуты да адказнасці. Тым не менш на наступны дзень, 11 сакавіка, яны накіраваліся да беларуска-літоўскай мяжы, каб незаконна трапіць у Еўрасаюз і «папрасіць палітычнага прыстанішча», чым і заслужылі папулярнасць у інтэрнэце. А 14 сакавіка гэтую парачку зноў затрымалі на мяжы з Літвой, праўда на гэты раз жаданне трапіць у ЕС тлумачылася «пошукам працы».

У выніку парушальнікаў прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці, аштрафаваўшы кожнага на 40 базавых велічынь. Пры гэтым у Дзяржаўным пагранічным камітэце Беларусі звяртаюць увагу на іх крымінальнае мінулае. У аднаго за плячыма судзімасць за разбой, збіванне і пагрозу, у другога — за згвалтаванне і крадзеж. За імі значыцца і мноства адміністрацыйных спагнанняў. Дарэчы, наступная спроба незаконна трапіць за мяжу штрафнымі санкцыямі не абмяжуецца і можа скончыцца для іх новым крымінальным артыкулам.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# ПАДЛЕТАК ВЫРАШЫЎ ПАСТРАЛЯЦЬ

**У Віцебску непаўналетні выстраліў у мужчыну, якога параніў. А цэліўся ў даму — толькі за тое, што яна спрабавала супакоіць шумную кампанію.**

— Хлопец святкаваў у кампаніі дзень нараджэння сябра. Сядзелі за сталом у кватэры, якая належыць бацькам аднаго з падлеткаў. Выпівалі, шумелі, перашкаджалі адпачываць суседзям па пад'ездзе. Жанчына з ніжняга паверха выйшла на вуліцу, зрабіла заўвагу моладзі, якая весялілася на балконе. У ходзе непрацяглай лаянкі наш «герой» пачаў страляць у суседку. Яе закрыў ад чарговага стрэлу сужыцель. Ён быў лёгка паранены ў руку, — паведаміла «Звяздзе» **памочніца пракурора г. Віцебска Яўгенія ПРУДНІКАВА.**

Як высветлілася падчас расследавання, у хлопца быў пісталет, які ён узяў у старэйшай сястры. Стралку за свае дзеянні свеціць да 10 гадоў пазбаўлення волі.

Падобны выпадак на гэтым тыдні зафіксаваны і ў Брэсце, калі супрацоўнікі міліцыі затрымалі 15-гадовага навучэнца каледжа будаўнікоў. Той з балкона бацькоўскай кватэры страляў з пнеўматычнага пісталета. Падлетак зрабіў некалькі выстралаў па школьніках 10 і 11 гадоў, што знаходзіліся ў двары дома. На шчасце, ніхто з дзяцей не пацярпеў, затое шкода была нанесена аўтамабілю, прыпаркаванаму ля дома. Падлетка затрымалі. Заведзена крымінальная справа па артыкуле «хуліганства».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*
**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

«Браты славяне»:

# «У ПЕРСАНАЖАХ НАШЫХ ПЕСЕНЬ ЛЮДЗІ ПАЗНАЮЦЬ СЯБЕ»

**«Браты славяне» — музычны праект, які пачаў існаваць у жніўні 2014 года. Першапачаткова гэта быў дуэт у складзе Міхаіла Ермаковіча і Сяргея Скаражонка, які нарадзіўся на базе творчага цэнтра імя У. Мулявіна ў 2005 годзе. Цяпер да іх далучыўся трэці музыкант Андрэй Каўзановіч. У свой час гурт стаў фіналістам праекта «Гарады, якія спяваюць» (2012), а восенню наступнага года атрымаў перамогу на «Зорным рынгу». Цяпер на рахунку калектыву з'явілася новае дасягненне — выхад першага паўнавартаснага альбома. Публіцы яго прэзентуюць толькі ў пачатку лета. Але музыканты загадзя завіталі да нас у рэдакцыю — мы пагаварылі з імі пра музыку, гастролі і замежныя канікулы.**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Дык чым будзеце здзіўляць публіку?***

**Сяргей:** Дыск складаецца з 15-ці беларускамоўных кампазіцый. У іх мы імкнёмся раскрыць вясковы побыт... з лірычнага боку. Бо гэтая тэма ў нас, мастакоў, літаратараў, музыкантаў, застаецца сёння без належнай увагі. Часта здараецца, што вось адбылася нейкая падзея вялікага маштабу, і варта вясковаму чалавеку выказацца з гэтай нагоды — і ты разумееш: яго выказванне трапляе ў цэль. Самі мы з горада Вілейкі і ведаем, што такое сельская гаспадарка. І атрымліваецца, апошнія гадоў дзесяць звяртаемся ў творчасці да гэтай тэмы. Калі мы паказваем зробленую музыку, то многія пазнаюць у персанажах нашых песень сваіх знаёмых. Але мы не ставім перад сабой мэту падколваць кагосьці альбо высмейваць. Проста бываюць сітуацыі ў нашым жыцці, калі можна пажартаваць. У нас, напрыклад, ёсць песня «Я і кум» — у ёй мужчыны за сорак імкнуцца паводзіць сябе, як у маладосці: заглядаюцца на маладых дзяўчат, выкарыстоўваюць у гаворцы англійскія слоўцы, каб выглядаць сучаснымі.

Музычны матэрыял нашага альбома мае розную стылістыку. Там можна знайсці нешта накшталт стылізаванай полькі ці адаптаванага беларускага кантры. Ёсць песня з элементамі рэпа — «Хачу ў сталіцу», а вось «Ты ляці, мой конь» — напамінае баладу. Прысутнічаюць кампазіцыі таксама з элементамі дыска, хіп-хопа, хард-рока...

***— І ў якой атмасферы праходзіла праца над альбомам?***

**Сяргей:** Ведаеце, у нас так павялося, што ў працэсе працы мы паспяваем і здзейсніць задуманае, і насмяяцца. Бывае, прыйдзеш на студыю запісваць бэк-вакал, настроішся спяваць чысценька, а потым слухаеш і знаходзіш «ляпы» — гэта выклікае смех. Увогуле адметная рыса нашага гурта ў тым, што мы прызнаем свае агрэхі і заўсёды можам пасмяяцца з сябе.

**Андрэй:** Я ў калектыве нядаўна, і мой унёсак пакуль нязначны. Асноўную працу выконваюць Міша і Сяргей. Але ў мяне дзякуючы ім ёсць магчымасць вучыцца і расці. Асабліва гэта адчувалася падчас запісу альбома, бо панавала творчая атмасфера.

**Сяргей:** Альбом з'яўляецца вынікам нашага самавыражэння. І мы спадзяёмся, што ад яго праслухоўвання ў людзей будзе ўзнімацца настрой. Увогуле, мне здаецца, калі публіка, завітаўшы на канцэрт таго ці іншага музыканта, адкрывае з дапамогай яго музыкі нешта добрае ў сабе, такі артыст мае права на існаванне.

***— На якой музыцы вы самі раслі, і што падабаецца слухаць сёння?***

**Сяргей:** Я перш за ўсё раўняўся на старэйшага брата. Калі той пачаў вучыцца іграць на гітары, то і мне захацелася тую навуку спасцігнуць. Валера стаў выступаць на танцпляцоўках — і ў мяне з'явілася такая самая мара. І слухалі мы ў прынцыпе аднолькавую музыку — Led Zeppelin, Pink Floyd, Beatles, Сцінга і, безумоўна, «Песняроў». У кожнага з іх было чаму павучыцца. Сёння на беларускай эстрадзе таксама ёсць людзі, творчасць якіх мы паважаем і слухаем. Напрыклад, Пётр Ялфімаў — у вакальным плане проста ўзор.

**Міхаіл:** Я пачынаў свой шлях у музыцы з народных песень. Потым быў перыяд, калі захапляўся джаз-рокам, любіў Джорджа Бэнсана. З часам адбылося наша знаёмства з Сяргеем, і мы пачалі іграць рок. Наш альбом быў напісаны не спантанна, ён з'явіўся як вынік назапашанага матэрыялу.

***— А калі і пры якіх абставінах вы ўсе сустрэліся і сталі адным калектывам?***

**Сяргей:** Спачатку ў 1994 годзе з Маладзечна прыехаў Міхаіл. Тады мой брат Валера працаваў у народным ансамблі «Весялінка», куды ён і запрасіў Мішу. Потым разам мы пачалі іграць у рэстаранах. А ў 2005-м нашу песню пра кабаноў падчас рэпетыцыі «Песняроў» выпадкова пачуў Шарапаў. Ён пацікавіўся аўтарамі, так мы і пазнаёміліся. Пачалі супрацоўнічаць з цэнтрам Мулявіна, дзве песні там запісалі. А цяпер працуем утрох.

***— Увогуле, што значыць музыка для вас?***

**Сяргей:** Гэта наш лад жыцця. Мы даём канцэрты як група, а таксама працуем выкладчыкамі ў гімназіі горада Вілейкі. Да таго, як утварыўся наш калектыў, мы з Міхаілам летам на працягу 15 гадоў працавалі ў Германіі. Як і многія ў той час, паехалі іграць на вуліцы, але выпадкова завялі знаёмства з мясцовымі і сталі выступаць у адной кавярні. Спачатку выконвалі інструментальную музыку, а калі сталі лепш размаўляць па-нямецку, пачалі яшчэ і спяваць.

***— Дзе бываеце цяпер?***

**Сяргей:** Адразу ж адзначу, што ёсць калектыў «Валерый Скаражонак і браты славяне», які мае пераважна прапесняроўскі рэпертуар, а «Браты славяне» — гэта каманда з трох чалавек, дзе працую я з Міхаілам і з Андрэем. Апошнія некалькі гадоў мы гастралюем менавіта ў такім складзе. Канцэрты даём пераважна ў Беларусі і ў нас, можна лічыць, зараз самы старт. Мы не пераследуем камерцыйныя мэты: калі атрымліваецца сыграць платны канцэрт — выступаем, але можам паўгадзіны ўдакладваць і без ганарару. Калі публіка добрая і з душой нас прымае, чаму б не падзяліцца з ёй сваёй музыкай?

***— Плануеце зладзіць серыю канцэртаў у падтрымку першага альбома?***

**Сяргей:** Безумоўна. Прадзюсара ў нас, на жаль, няма, таму самі шукаем месцы для выступленняў. Часам у гэтым дапамагаюць сувязі і знаёмствы ў музычным свеце. Спачатку думаем у чэрвені зладзіць прэзентацыю ў Вілейцы, а там будзем глядзець, куды рушыць далей.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*


# «ПАДАРУНАК СЕЙБІТАМ!»

**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**

**на II квартал або I паўгоддзе 2016 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце**
**ДА 13 КРАСАВІКА 2016 ГОДА**
**ў рэдакцыю на адрас:**
**220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**







Сярод падпісчыкаў 14 красавіка будуць разыграны 7 палівальных набораў Karcher і суперпрыз — цяпліца з полікарбанату «Аграсфера Стандарт». Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.04.2016 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.06.2016 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або I паўгоддзе 2016 г. і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні «Падарунак сейбітам!» чытайце ў нумары газеты «Звязда» ад 12.03.2016 г.

**Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.**

**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 16.03.2016 г. па 30.06.2016 г.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2714 ад 10.03.2016 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

**1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2016 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
**(аддзяленне сувязі)**

____________________ **на II кв. або 1–е паўг. 2016 года**

**Хатні адрас і тэлефон** **(абавязкова)** [ ] **(індэкс)** ____________________

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**


■ «Еўрабачанне-2016»

## БУКМЕКЕРЫ СТАВЯЦЬ НА РАСІЮ

**Больш як 3,7 мільёна праглядаў за 10 дзён — столькі сабраў афіцыйны кліп прадстаўніка Расіі на «Еўрабачанні» Сяргея Лазарава.**



**Для параўнання: відэа беларускага канкурсанта Аляксандра Іванова (ён жа IVAN) мае ў актыве крыху больш як 100 тысяч праглядаў за месяц. Зрэшты, пакуль што ўсе гэтыя вынікі — проста статыстыка, а не гарантыя пэўных пераваг, асабліва з улікам прынятых арганізатарамі новых правілаў галасавання. Афіцыйна ж на нядаўняй сустрэчы кіраўнікоў дэлегацый краін, якія бяруць удзел у «Еўрабачанні-2016», гучалі іншыя лічбы.**

Усе 43 краіны-ўдзельніцы 61-га песеннага шоу назвалі сваіх прадстаўнікоў і прадставілі для зацвярджэння ў Еўрапейскі Вяшчальны саюз песні ды іншыя неабходныя для падрыхтоўкі шоу матэрыялы. Выключэнне было зроблена толькі для Балгарыі, якой дазволілі ўскочыць у апошні вагон і прадставіць песню 20 сакавіка. Папоўніць музычную калекцыю зборнікам 2016 года аматары конкурсу змогуць праз месяц — 15 красавіка ўбачаць свет афіцыйны альбом «Еўрабачання-2016» і яго лічбавая версія, а вось DVD-дыск, на які патрапяць запісы ўсіх трох шоу, з'явіцца ў продажы толькі ў сярэдзіне чэрвеня.

Акрамя таго, прадстаўнікі ЕВС назвалі меркаваныя даты наступнага конкурсу: у 2017 годзе паўфіналы песеннага спаборніцтва адбудуцца 16 і 18 мая, а фінал — 20 мая. Зрэшты, гэта справы будучыя, а бліжэйшыя — размеркаванне парадкавых нумароў у сёлетнім шоу — завершацца цягам некалькіх тыдняў. Пакуль жа свой нумар атрымала толькі краіна-гаспадыня «Еўрабачання-2016» **Швецыя: 17-гадовы спявак Франс** выйдзе на сцэну ў фінале конкурсу 14 мая пад нумарам 9.



Дарэчы, за два месяцы да шоу менавіта шведскі ўдзельнік, паводле прагнозаў еўрапейскіх букмекерскіх кантор, з'яўляецца адным з лідараў гонкі за хрустальным мікрафонам. У якасці другога найбольш верагоднага пераможцы разглядаецца прадстаўнік Расіі Сяргей Лазараў — нягледзячы нават на тое, што з правільна-хітовай танцавальнай песні апошняга «You Are The Only One» відавочна «тырчаць вушы» Філіпа Кіркорава, а падчас праслухоўвання навязліва ўспլывае рэфрэн песні грэчаскай пераможцы «Еўрабачання-2005» Хелены Папарызу.

Таксама ўваходзяць у букмекерскія топ-5 Харватыя, Латвія і леташні дэбютант Аўстралія. Апошнюю, на хвіліначку, зусім не еўрапейскую краіну-ўдзельніцу еўрапейскага конкурсу прадставіць сёлета... этнічная азіятка (!) — 27-гадовая спявачка карэйскага паходжання Дамі Ім. А вось **артысту з Беларусі Аляксандру Іванову** прадракаюць месца за межамі фіналу, але хто ведае — магчыма, яго песня «Help Yoy Fly» («Дапамагу табе паляцець») сапраўды дапаможа ўзняцца вышэй?



Пра гэта мы даведаемся ўжо 12 мая па выніках другога паўфіналу «Еўрабачання». Пакуль жа IVAN штодня рэпеціруе, наведвае ўрокі па вакале і акцёрскім майстэрстве, удасканальвае з дапамогай выкладчыка з Ліверпуля англійскае вымаўленне, шукае выйгрышны сцэнічны вобраз і рыхтуецца да здымак відэавізітоўкі, што пройдуць у Мінску 30-31 сакавіка.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■




# СПАКУСЛІВАЯ МАЛАДЗІЦА ДАЛА ДЗЁРУ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Сёння ў асноўным размова пойдзе пра беларускія прыметнікі. Тыя, што ўжываюць у маўленні ў тым ліку і ў якасці кампліментаў. Ці ведалі вы, што:**

**Цнатлі́вая** — строгая ў маральных адносінах.

**Згра́бная** — прапарцыянальна і прыгожа складзеная.

**Натхня́льная** — якая абуджае, уздымае захапленне.

**Спаку́слівая** — прывабная, якая ўзбуджае пачуццёвую цягу.

**Чуллі́вая** — здольная тонка адчуваць.

**Пяшчо́тная** — ласкавая, поўная замілавання.

**Даць дзёру** — уцячы, кінуцца на ўцёкі. Беларускія адпаведнікі: *даць драла, даць драпака, зматаць вудачкі*. Рускія: *дать стрекоча, взять ноги в руки*.

**Ні горача ні холадна** — абыякавыя адносіны да нечага. Беларусы яшчэ скажуць: *і гора мала, хоць трава не расці, як з гусі вада*. Рускія: *ни жарко ни холодно, по барабану*.

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

# «LADY БЛОГ» НА «ДВОЙЦЫ»

**20 сакавіка на тэлеканале «Беларусь 2» у 11.50 прэм'ера новага тэлевізійнага і інтэрнэт-праекта «Lady Блог». Дзе пра ўсё, што цікавіць сучасных дзяўчат і жанчын — моду, здароўе, конкурсы, культурныя агляды і многае іншае, будуць расказваць розныя вядучыя влогеры (не блытаць з блогерамі), якія «спецыялізуюцца» менавіта на відэазапісах.**



Асновай влога-формы з'яўляюцца запісы, дзе спалучаюцца відэа з падтрымкай тэксту, малюнкаў і іншых даных. Яны могуць быць зроблены ў выглядзе аднаго блока ці складацца з некалькіх частак. Такія ролікі вельмі папулярныя ў інтэрнэце, бо з дапамогай влогаў гледача падпускаюць на блізкую адлегласць да аўтара. Пасля прагляду аўдыторыя літаральна адчувае, што аўтар для іх як сябар.

Вядучымі влогерамі праекта «Lady Блог» выступілі ўжо вядомыя і папулярныя блогеры, модныя журналісты. У першых выпусках у якасці вядучых можна ўбачыць лідараў інстаграм, беларускую Барбі Кацярыну Кобу, дызайнера і мадэль Інэсу Кунцэвіч і многіх іншых. Таксама ў ролі вядучых влогаў выступілі вядомыя артысткі — Ніна Кароль, Улада, Галіна Шышкова, Леся Кодуш, Наталі Рашэ... У рамках праекта стартаваў конкурс сярод паспяховых 18 відэаблогераў Беларусі. У відэамайстэрстве пазмагаюцца найлепшыя майстры блогасферы нашай краіны. Візітоўкі ўдзельніц можна будзе кожны тыдзень убачыць у эфіры, а найлепшая стане вядучай «Lady Блог». Усе выпускі праекта глядзіце кожную нядзелю ў эфіры тэлеканала «Беларусь 2».

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

## Панядзелак, 21 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.05** Зона X.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Клуб рэдактараў.



**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05 Серыял «Парфумерка».**
**11.55 Меладрама «Палюбоўнік для Люсі».**
**13.50, 16.05 Меладрама «Разарваныя ніці».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.45** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** Форум з Дзмітрыем Бачковым.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**23.40** Дзень спорту.
**23.55 Камедыя «Бландзінка за вуглом».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.10, 21.05** Тэлебарометр.
**9.10, 22.10** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
**10.45** Азбука смаку.
**11.20** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**12.40 Серыял «Косці».**
**16.35 Трагікамедыя «Небраска».**
**18.40 Серыял «Вароніны».**
**19.15** Суперлато.
**20.05** «Дзённік экстрасэнса з Фацімой Хадуевай».
**21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**22.05** КЕНО.
**23.15** Рэпарцёр.
**0.05 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**0.55** «Разбуральнікі міфаў».

### Беларусь 3

**7.50, 12.00, 18.15, 23.05** «Калейдаскоп».
**8.05 «Адкрытая кніга». Драма. Фільм першы.**
**9.10** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**10.05** «Наперад у мінулае».
**10.30, 18.30, 21.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.05** «Музеі Беларусі». Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.
**11.30** «По имени и житие...» Дак. фільм.
**12.15** «Гітара па крузе». Аўтар-выканаўца Міхаіл Семяненка і музыкант Таццяна Ханазанава.
**13.15, 21.35** «Час кіно».
**13.25 «Чалавек, якога не было». Драма.**
**14.55** «Чэрвень 41-га. Заходні асобы». Дак. фільм.
**15.35 «Яго батальён». Драма.**
**17.45** «Дыя@блог». «Пра мову».
**18.35** «Ледзяная зямля». Дак. фільм.
**19.30 «Адкрытая кніга». Драма. Фільм другі. 1-я серыя.**
**20.40** «Калыханка».
**21.45 «Гамлет Шчыгроўскага павета». Драма.**
**23.20** «Геапалітыка: свет за тыдзень».

### Беларусь 5

**7.15, 18.45** PRO спорт. Навіны.
**7.25, 23.15** Баскетбол. НБА. «Далас» — «Портленд».
**9.05** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/2 фіналу. Сёмы матч.
**11.00** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Байзанс».
**12.35** Спартыўная гімнастыка. Кубак свету. Штутгарт.
**16.40** Тэніс. Турнір ВТА. Індыян-Уэлс. Фінал.
**18.55** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. Сёмы матч. «Юнацтва-Мінск» — «Нёман» (Гродна).
**21.05** PRO спорт. Вынікі.
**21.35** Час футбола.
**22.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здарова!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Адваротны адлік». «Беларусы ў Аўстраліі. Подзвіг анзакаў».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15 Камедыя «Кухар на колах».**
**0.15** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05 «Немец». Серыял.**
**15.45** «Вадзіць па-руску».
**16.00** «Часткі свету».
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тыдзень спорту».
**23.30** «Тайны Чапман».
**0.25 Маст. фільм «Пасажыр пад дажджом».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Беларусь сёння».
**9.30 Серыял «Па той бок ваўкоў», 1—4 серыі.**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Маст. фільм «Танцор дыска».**
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**16.50** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20, 19.20 Серыял «Тонкая грань».**
**20.10 Серыял «Развод».**
**21.05 Маст. фільм «Найлепшая бабуля».**
**23.00 Серыял «Метад Фрэйда».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.10** Ток-шоу «Слова за слова».
**1.05 Серыял «Фаварыт», 1—2 серыі.**
**2.55 Серыял «Два бакі адной Ганны».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.40** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Касатка».**
**19.10, 20.55 Серыял «Гюльчатай. Дзеля кахання».**
**22.00, 23.10 Серыял «Ленінград 46».**
**23.55** «Сумленны дэтэктыў».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Месца сустрэчы».
**15.00** «Люстэрка для героя».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**
**21.20, 23.00 Серыял «Прафесіянал».**
**22.30** «Вынікі дня».
**23.50 Серыял «Дэсант ёсць дэсант».**

### 8 канал

**7.00, 14.10, 19.40, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.45 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**8.35 Серыял «Тайны стагоддзя».**
**11.45** Дак. фільм «Золата інкаў».
**12.45, 13.55, 15.45, 16.40, 18.20, 19.30, 20.55** «Хатняя крама».
**13.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.15 Серыял «Венцаносная багіня».**
**16.30** «Кінаблакнот».
**16.55 Серыял «Позняе раскаянне».**
**18.25 Серыял «Наложніца».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Баявік «Джэк Рычэр».**
**23.15 Серыял «Сучасны Патрашыцель».**

### ВТБ

**6.30, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30, 17.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.40** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Вароніны 3».
**9.30, 14.00** Серыял «Мамачкі».
**10.30, 3.30** «Кіно ў дэталях».
**11.30** Трылер «Заражэнне».
**15.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.00** «Лаві момант».
**19.00** Серыял «Сямейны бізнес 2».
**20.00** Серыял «Кухня 6».
**21.10** Камедыя «Вяселле па абмене».
**23.30, 3.30** Серыял «Косці».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Назіральнік».
**11.15** «Доктар Калюжны». Маст. фільм.
**12.40** «Лінія жыцця». Ганна Шацілава.
**13.40** «Чалавек ніадкуль». Маст. фільм.
**15.10** «Альфавіль». Маст. фільм.
**16.45** «Сталіца лялечнай імперыі». Дзяржаўны акадэмічны цэнтральны тэатр лялек імя С.У. Абразцова.
**17.15, 1.25** Сусветныя скарбы.
**17.30** Майстры фартэпіяннага мастацтва. Мікалай Луганскі.
**18.20** «Каміль Каро». Дак. фільм.
**18.30** «Больш чым каханне». Ігар Ільінскі і Таццяна Бітрых-Ерамеева.
**19.15** «Дабранач, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Саці. Нясумная класіка...»
**20.45** «Жывое слова».
**21.25** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял.
**21.55** «Тым часам».
**22.40** «Усё праходзіць...» Дак. фільм.
**23.30** «Гай Юлій Цэзар». Дак. фільм.
**23.55** Мастсавет.
**0.00** «Энігма. Дзмітрый Аляксееў».
**0.40** Майстры фартэпіяннага мастацтва. Дзмітрый Аляксееў.
**2.40** Ф. Шуберт. Саната для скрыпкі і фартэпіяна.

### Настальгія

**6.00** «Зямля—Паветра». «Ветлівая адмова». 2003 год.
**7.20, 11.25, 12.45, 13.35, 14.25, 17.15, 18.55, 20.35, 21.40, 23.00, 23.40, 0.40, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.50, 13.50** «Смяяцца, сапраўды, не грэшна...» Гумарыстычная праграма.
**8.35** М/ф «Шэрая Шыйка».
**9.00** «Быў час». 2009 год.
**10.00** Маст. фільм «Начальнік Чукоткі».
**12.00** «Акулы пяра». Аляксандр Градскі. 1998 год.
**13.20** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». Салют акцёрам свету. 1991 год.
**15.00** Фільм-канцэрт Б. Грабеншчыкова і яго гурта «Аквариум». 1990 год.
**16.00** Маст. фільм «Жнівень, які збягае».
**18.00** Дак. фільм «Дысідэнты».
**19.20** Маст. фільм «Дыялог з працягам».
**20.45** «Навука і тэхніка». 1986 год.
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**23.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 2005 год.
**0.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Уладзімір Этуш.
**1.20** Маст. фільм «У маёй смерці прашу вінаваціць Клаву К.».
**4.00** «Колба часу».

### EuroSport 1

**7.45, 21.10** Зімовыя віды спорту.
**8.45, 16.00, 23.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету ў памяшканні.
**10.30** Фехтаванне. Этап Гран-пры.
**11.30, 13.30, 19.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**12.00, 22.10, 2.05** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**14.15, 20.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**15.00** Веласпорт. Мілан — Сан-Рэма.
**17.30** Веласпорт. Вуэльта Каталоніі.
**19.30** Конны спорт. «Перавага коней».
**21.05** «Наперад па золата».
**0.45** Watts.
**1.05, 2.00** Футбол. Еўрагалы.
**1.10** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты 3-га тура.
**1.35** Футбол. «Няхай жыве Францыя».

### Камедыя

**0.40, 16.10** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі».
**2.25, 21.30** Камедыя «Псіхі на волі».
**4.00, 23.05** Камедыя «Дыска».
**5.45** Меладрама «Каханне без перасадак».
**7.20** Камедыя «Імя».
**9.10** Камедыя «Дублёр».
**10.35** Камедыя «Багіня».
**12.20** Камедыя «Бос у гасцінай».
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**18.00** Меладрама «Выпадковы муж».
**19.40** Камедыя «Блізня».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.20, 4.45** «Доктар I...»
**7.50, 19.00, 0.55** «Іфет». Серыял.
**9.25, 3.10** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.15, 3.55** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.15** «Экстрасэнсы супраць вучоных».
**12.10, 2.25** «Нераскрытыя тайны».
**13.05** «Апошняя роля Рыты». Меладрама.
**15.05** «Каменская». Серыял.
**16.10** «Хатні рэстаран».
**17.05** «Дзеці індыга. Новае выпрабаванне для дарослых». Дак. фільм.
**17.55** «Пятая варта». Серыял.
**20.50, 0.10** «Мар'ін Гай». Серыял.
**21.45** «Браты па абмене». Серыял.
**22.35** «Развітанне».
**23.20** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**5.10** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.00, 18.10** Трылер «Урачысты фінал».
**8.10, 4.10** Драма «Галгофа».
**10.10, 2.10** Камедыя «Кухар на колах».
**12.10** Трылер «Прафесіянал».
**14.10** Камедыя «Сужэнцы Морган ва ўцёках».
**16.10** Камедыя «Вядзьмарка».
**20.00** Драма «Маленькія жанчыны».
**22.10** Меладрама «Даю год».
**0.10** Драма «Штосьці не так з Кевінам».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Фантастыка «Паляўнічы».
**8.20, 2.20** Камедыя «Ёлкі кудлатыя».
**10.20, 4.20** Меладрама «Вечнае вяртанне».
**12.20** Драма «Ахоўвай мяне, мой талісман».
**14.10** Камедыя «Усё ўключана 2».
**16.20** Камедыя «Заказ на аднаго».
**20.20** Камедыя «Аддамся ў добрыя рукі».
**22.20** Драма «Іуда».
**0.20** Драма «Нябесны суд. Працяг».

### National Geographic

**6.00, 5.30** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**7.40, 17.55, 21.00, 0.50, 4.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**8.30, 18.40, 21.45, 1.40, 3.10, 4.45** Расследаванні авіякатастроф.
**9.15, 14.00, 19.30** Даследчык 2.0.
**10.50** Дзікі тунец.
**11.40** Шаша праз пекла.
**12.25** Злавіць кантрабандыста.
**13.10, 0.05** Зрабі або памры.
**13.35, 0.30** Навуковыя недарэчнасці.
**15.30** Золата ў халоднай вадзе.
**16.20** Сіла племя.
**17.05** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
**23.20, 2.25** Уварванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00, 12.30** Дарожныя каўбоі.
**8.50** Чалавек і Сусвет.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40** Паляўнічыя на склады.
**11.35, 22.00, 1.00, 7.15** Востраў.
**13.25, 6.25** Што было далей?
**15.15, 5.40** Хуткія і гучныя.
**16.10, 3.00** Махінатары.
**17.05** Паляўнічыя на склады.
**18.00** Апошнія жыхары Аляскі.
**19.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**20.00** А ты б выжыў?
**23.00** Зорнае выжыванне.
**0.00** Мужчыны, жанчыны, прырода.
**2.00, 4.50** Багажныя войны.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## Аўторак, 22 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.50 Серыял «Парфумерка».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Паміж намі дзяўчынкамі».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.55** Сфера інтарэсаў.
**20.00, 0.45 Серыял «Другое паўстанне Спартака».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**0.30** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 17.25** Капейка ў капейку.
**9.30, 22.10** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
**10.30, 16.15 Трылер «Закрытая школа».**
**11.35, 19.55** «Дзённік экстрасэнса з Фацімой Хадуевай».
**12.45, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**13.50, 17.55 Серыял «Вароніны».**
**15.30, 23.15** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**19.00 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**22.05** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**0.10 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### Беларусь 3

**8.00, 12.20, 18.20, 23.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 19.20 «Адкрытая кніга». Драма. Фільм другі.**
**9.25** «Міхаіл Таніч: Усё добрае — не забываецца». Канцэрт.
**10.20 «Пушчык едзе ў Прагу». Прыгоды.**
**11.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Льва Абеліёвіча.
**12.35** «Час кіно».
**12.45 «Гамлет Шчыгроўскага павета». Драма.**
**14.05** «Кіно і час». Беларускі космас.
**14.45** «Вяртанне ў Хатынь». Фільм-спектакль.
**16.20 «6:3». Камедыя.**
**17.50** «Дыя@блог». «Пра вечнае».
**18.35, 21.00** «Героі і ахвяры халоднай вайны». Атручаныя цыгары і ракеты на Кубе. Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.40 «Там, дзе квітнеюць эдэльвейсы». Прыгоды.**

### Беларусь 5

**7.15** PRO спорт. Вынікі.
**7.40** Баскетбол. НБА. «Атланта» — «Вашынгтон».
**9.25** Авертайм.
**9.50** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. Сёмы матч. «Юнацтва-Мінск» — «Нёман» (Гродна).
**11.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**12.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Ханты-Мансійск. Спрынт. Жанчыны.
**13.45** Біятлон. Этап Кубка свету. Ханты-Мансійск. Спрынт. Мужчыны.
**15.10** Час футбола.
**15.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**16.50** «Спорт, спорт, спорт». Андрэй Барбашынскі.
**17.15** Гандбол над Бугам.
**17.55** Спорт-кадр.
**18.25** Міні-футбол. Кваліфікацыя да чэмпіянату свету-2016. Першы матч. Беларусь — Расія.
**19.45, 22.35** PRO спорт. Навіны.
**19.55** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. Сёмы матч. «Шахцёр» (Салігорск) — ХК «Гомель».
**22.05** «Місія — Рыа». Відэачасопіс.
**22.45** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. Фінал. Першы матч.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Чырвоная каралева».**
**23.00 Серыял «Пасля школы».**
**0.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Тайны Чапман».
**9.25, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.20** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Драма «Шулеры».**
**16.00** «Вадзіць па-руску».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**0.35 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Агульны інтарэс».
**9.30 Серыял «Востраў непатрэбных людзей».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Маст. фільм «Прага помсты».**
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**16.50** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20, 19.20 Серыял «Тонкая грань».**
**20.10 Серыял «Развод».**
**21.05 Маст. фільм «Помста — мастацтва».**
**23.00 Серыял «Метад Фрэйда».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.10** Ток-шоу «Слова за словам».
**1.05 Серыял «Фаварыт».**
**2.55 Серыял «Два бакі адной Ганны».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.30, 23.55** «Гульні разведак. Немузычная гісторыя». «Іншыя. Цела. Нічога немагчымага». Частка 2-я.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Касатка».**
**19.10, 20.55 Серыял «Гюльчатай. Дзеля кахання».**
**22.00, 23.10 Серыял «Ленінград 46».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Месца сустрэчы».
**15.00** «Люстэрка для героя».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**
**21.20, 23.00 Серыял «Прафесіянал».**
**22.30** «Вынікі дня».
**23.50 Серыял «Дэсант ёсць дэсант».**

### 8 канал

**7.00, 14.15, 19.45, 21.00** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**8.30, 18.30 Серыял «Наложніца».**
**9.35, 13.10, 14.00, 15.45, 16.45, 18.25, 19.35, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45** «Мой любімы гадаванец».
**10.15** Дак. серыял «Асуншых акіян. Бермудскі трохкутнік».
**11.00 Баявік «Джэк Рычэр».**
**13.15 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.20 Серыял «Венцаносная багіня».**
**16.30** «Кінаблакнот».
**17.00 Серыял «Познее раскаянне».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Манон Леско».**
**23.10 Серыял «Сучасны Патрашэцель».**

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Лаві момант».
**6.30, 23.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.20** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Вароніны 3».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Сямейны бізнес 2».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Кухня 6».



**11.30** Камедыя «Вяселле па абмене».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Камедыя «Карпаратыў».
**23.30, 3.30** Серыял «Косці».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 0.45** «Твар на мішэні». Маст. фільм. 1-я серыя.
**12.30** Дакументальная камера. «Кіно. Маніфест сямі мастацтваў».
**13.15** «Эрмітаж».
**13.40** «Шарль Перо». Дак. фільм.
**13.50** «Бераг яго жыцця». Маст. фільм. 1-я серыя.
**15.10, 20.45** «Жывое слова».
**15.50** «Усё праходзіць...» Дак. фільм.
**16.40** «Канстанцін Цыялкоўскі». Дак. фільм.
**16.50** «Саці. Нясучная класіка...»
**17.30** Майстры фартэпіяннага мастацтва. Дзмітрый Аляксееў.
**18.10** Сусветныя скарбы.
**18.30** «Больш чым каханне». Георгій Юматаў і Муза Крэпкагорская.
**19.15** «Дабранач, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**21.25** «Заўтра не пампрэ ніколі». Дак. серыял.
**21.55** «Гульня ў бісер». «А.П. Гайдар. «Цімур і яго каманда».
**22.35** «Аляксандр Гадуноў. Свет, у якім даводзіцца танцаваць». Дак. фільм.
**23.55** Мастсавет.
**0.00** Крытык. «Хто такі Іван Вырыпаеў?»

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Аляксандр Градскі. 1998 год.
**6.45, 7.35, 8.25, 11.15, 12.55, 14.35, 15.40, 17.00, 17.40, 19.10, 20.50, 21.40, 23.00, 1.20, 5.25** Музычная настальгія.
**7.20** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». Салют акцёрам свету. 1991 год.
**7.50, 1.50** «Смяяцца, сапраўды, не грэшна...» Гумарыстычная праграма.
**9.00** Фільм-канцэрт Б. Грабеншчыкова і яго гурта «Акварыум». 1990 год.
**10.00** Маст. фільм «Жнівень, які збягае».
**12.00** Дак. фільм «Дысідэнты».
**13.20** Маст. фільм «Дыялог з працягам».
**14.45** «Навука і тэхніка». 1986 год.
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**17.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 2005 год.
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Палілкоўскім: «Магія і перабудова». 2007 год.
**18.55** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». 1991 год.
**19.20** Маст. фільм «Горад з раніцы да поўначы».
**0.00** «Зямля—Паветра». «Ветлівая адмова». 2003 год.
**2.35** М/ф «Шэрая Шыйка».
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Маст. фільм «Начальнік Чукоткі».

### EuroSport 1

**3.30, 12.00, 16.30, 1.05** Веласпорт. Вуэльта Каталоніі.
**5.00** Зімовыя віды спорту.
**6.00, 13.15, 21.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**6.45, 9.45, 21.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**7.30, 19.15, 2.15** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**8.45, 9.40, 14.00, 14.55** Футбол. Еўрагалы.
**8.50, 14.05** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты 3-га тура.
**9.15, 14.30** Футбол. «Няхай жыве Францыя».
**10.30, 15.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету ў памяшканні.
**19.45** Зімовыя віды спорту.
**20.45** Горныя лыжы. Кубак Кутатра.
**22.00** Снукер. The Players Championship.

### Камедыя

**0.45, 12,25** Меладрама «Выпадковы муж».
**2.25** Меладрама «Каханне без перасадак».
**4.05** Меладрама «Дзённік кар'ерысткі».
**5.30, 21.25** Камедыя «Цудоўная чацвёрка».
**7.00** Камедыя «Багіня».
**8.45** Камедыя «Бос у гасцінай».
**10.35** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі».
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.10** Камедыя «Блізня».
**18.00** Камедыя «Вяселлі і іншыя непрыемнасці».
**19.40** Камедыя «Горка».
**22.55** Камедыя «Імя».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00** «Доктар І...»
**8.30, 19.05, 0.55** «Іфет». Серыял.
**10.00, 3.10** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 3.55** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.50, 16.10** «Хатні рэстаран».
**12.45, 2.20** «Нераскрытыя тайны».
**13.40** «Мой герой».
**14.30, 4.45** «Псіхасаматыка».
**15.05** «Каменская». Серыял.
**17.05, 21.45** «Браты па абмене». Серыял.
**18.05** «Пятая варта». Серыял.
**20.50, 0.10** «Мар'ін Гай». Серыял.
**22.35, 5.15** «Зоркі і містыка».
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.00, 18.00** Трылер «Прафесіянал».
**8.10, 4.10** Меладрама «Даю год».
**10.10, 2.10** Драма «Маленькія жанчыны».
**12.10** Драма «Штосьці не так з Кевінам».
**14.10** Драма «Галгофа».
**16.05** Камедыя «Кухар на колах».
**20.00** Прыгоды «Джуманджы».
**22.10** Камедыя «Эд з тэлевізара».
**0.20** Камедыя «Дарослая нечаканасць».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Фантастыка «Паляўнічы».
**8.20, 2.25** Драма «Іуда».
**10.20, 0.35, 4.25** Драма «Някрасны суд. Працяг».
**12.20** Фантастыка «Падземелле ведзьмаў».
**14.20** Камедыя «Ёлкі кудлатыя».
**16.10** Меладрама «Вечнае вяртанне».
**20.20** Трагікамедыя «Піянеры-героі».
**22.25** Драма «Белая белая ноч».

### National Geographic

**6.00, 7.40, 17.50, 21.00, 0.50, 4.00, 5.35** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**8.30, 18.40, 21.45, 1.40, 4.45** Чалавек супраць YouTube.
**9.20, 14.00, 19.25** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**10.05, 14.50, 20.10, 22.30, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.
**10.50** Дзікі тунец.
**11.40** Шаша праз пекла.
**12.25** Злавіць кантрабандыста.
**13.10, 0.05** Зрабі або памры.
**13.40, 0.30** Навуковыя недарэчнасці.
**15.35** Золата ў халодных вадзе.
**16.20** Інстынкт выжывання.
**17.05** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
**23.20, 2.25** Уварванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00, 12.30** Хуткія і гучныя.
**8.50** Што было далей?
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Багажныя войны.
**11.35, 7.15** Буйны ўлоў.
**13.25, 6.25** Навука магіі.
**15.15, 1.00, 5.40** Страсць да матораў.
**16.10, 3.00** Махінатары.
**18.00** Мужчыны, жанчыны, прырода.
**19.00** Зорнае выжыванне.
**20.00** Вострваў.
**22.00** Мяцежны гараж.
**23.00** Бітва рэт-родаў.
**0.00** Праз любоў да машын.
**2.00, 4.50** Бітва за нерухомасць.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## Тэлесеткі

# «ДАЧНЫ» СЕЗОН НА «БЕЛАРУСЬ 1»

**19 сакавіка ў 9.50 у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» стартуе новы сезон праекта «Дача» вытворчасці тэлерадыёкампаніі «Магілёў».**

У новых выпусках трэцяга сезона папулярнай праграмы вядучая Тацццяна Ларына і яе пастаянны памочнік — тэлеаператар Юрый Аўласцаў — працягнуць падарожжа па Беларусі, каб сустрэцца з людзьмі, якія прысвяцілі дачным прамудрасцям не адзін дзясятак гадоў і дабіліся выдатных вынікаў... Зноў будзе праца на градах, вырошчванне кветак і многае іншае з магчымасцю даведацца парады аднадумцаў і спецыялістаў. Бо не сакрэт, што для многіх класічныя «6 сотак» — гэта не проста свая хата за горадам, зямельны ўчастак ці сад, а сапраўдная філасофія жыцця. У сезоне 2016 года ў праекце з'явіцца новая рубрыка «Карысныя хітрасці», дзе можна будзе пазнаёміцца з самымі каштоўнымі і ўнікальнымі парадамі вопытных дачнікаў з розных рэгіёнаў нашай краіны з улікам асаблівасцяў мясцовага клімату.

І, безумоўна, які ж дачны сезон без атмасферы спаборніцтва? Спецыяльна для самых азартных уладальнікаў прысядзібных участкаў аўтары праекта аб'яўляюць конкурс. Для ўдзелу ў ім гледачам тэлеканала «Беларусь 1» трэба будзе даслаць фотаздымак па тэме «У мяне на лецішчы...» і коратка ў пісьмовай форме расказаць пра свае «6 сотак». Абмежаванняў па колькасці фота няма. Але ўдзельнічаць у конкурсе змогуць толькі грамадзяне Беларусі, якія ўжо дасягнулі 18-гадовага ўзросту. Матэрыялы прымаюцца да 16.09.2016 года ўключна, іх можна даслаць на адрас: вул. Першамайская, д. 83, 212030, Магілёў з адзнакай «Конкурс «Дачны сезон» альбо на электронную скрыню: dacha@tvrmogilev.by. Пераможцамі стануць удзельнікі, чые фотаздымак і аповед, на думку камісіі конкурсу, стануць найлепшымі. Іх чакаюць карысныя і неабходныя ў гаспадарцы прызы: за першае месца — бензапіла, за другое — садовыя нажніцы, а за трэцяе — апырсквальнік. Дзяліцеся сваімі гісторыямі і няхай фартуна вам усміхнецца!

# ЧУМА ХХ СТАГОДДЗЯ — НА «ФОРУМЕ»

**21 сакавіка тэлеканал «Беларусь 1» і Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі прадстаўляць увазе гледачоў чарговы выпуск папулярнага грамадска-палітычнага ток-шоу «Форум». «Жыццё насуперак» — пад такім слоганам выйдзе праграма гэтым разам. Вядучы Дзмітрый Бачкоў разам з экспертамі ў студыі будуць гаварыць пра ВІЧ.**

Чума ХХ стагоддзя, якая не шкадуе нікога, нават абагрэтых праменямі сусветнай славы. Менавіта так яшчэ некалькі гадоў таму гаварылі пра СНІД. Мільёны пакалечаных лёсаў па ўсёй планеце і статус выгнанніка. Увесь гэты час хворыя, а таксама эксперты і валанцёры спрабуюць даказаць: яны — не пракажоныя, а такія, як і ўсе іншыя. Аднак ці чуюць іх людзі побач? У панядзелак у ток-шоу «Форум" мы пачуем рэальныя гісторыі, якія раней не агучваліся публічна... Як жывуць людзі з ВІЧ? Ці ёсць шанц на паўнавартасную будучыню ў дзяцей, для якіх страшны дыягназ стаў адзінай спадчынай ад бацькоў? Стваральнікі праекта прапануюць тэлегледачам разам абмеркаваць, як гэта — «Жыць насуперак»... Далучайцеся да эфіру ў панядзелак 21 сакавіка на тэлеканале «Беларусь 1».

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Поспех, перш за ўсё матэрыяльнага характару, чакае вас. Можаце разлічваць на падтрымку навакольных, але, праўда, вы самі павінны накіроўваць іх энергію ў патрэбнае рэчышча. Спрыяльна складваюцца абставіны для таго, каб узяцца за якую-небудзь новую справу. Для кар'ерных і іншых рабочых пытанняў тыдзень спрыяльны, а вось у асабістым жыцці могуць наспяваць праблемы. Адсутнасць разумення паміж вамі і вашым партнёрам, сумненні ў пачуццях могуць прывесці да негатыўнага выніку.

